# «Зачыркнутаму верыць»

## Яшчэ раз пра ступень верагоднасці следчых матэрыялаў АДПУ, НКУС і МДБ (па справах Філістовіча і Ластоўскага)

**Дадзеная публікацыя працягвае цыкл матэрыялаў, якія друкаваліся ў мінулых нумарах «Беларускай думкі»* і былі заснаваны па большай частцы на дакументах з Цэнтральнага архіва КДБ Рэспублікі Беларусь. Актуальнай жа нагодай для ўзнаўлення гэтага цыклу стала нядаўняя рэцэнзія, альбо, хутчэй, кароткая рэпліка Алеся Юркаўца «Вузкая шчыліна ў цёмны пакой», змешчаная ў часопісе «Arche-Пачатак» (№ 11–12 за 2009 год), наконт нашай дакументальнай публікацыі пра Я. Філістовіча.**

Рэцэнзія гэта, нягледзячы на сваю агульную танальнасць (маўляў, чаго чакаць добрага ад заангажаваных афіцыёзных даследчыкаў), тым не менш закранае шэраг важных праблем, звязаных з вывучэннем і ўвядзеннем у навуковы ўжытак следчых матэрыялаў АДПУ, НКУС і МДБ за 1920–1950-я гады.

Найперш, вядома, трэба адхіліць некаторыя палітызаваныя прэтэнзіі, якія выглядаюць трохі дзіўнымі. У рэцэнзіі А. Юркаўца гучаць ноты крыўды на тое, што не ўсе даследчыкі, на яго думку, маюць доступ да ведамаснага архіва КДБ. «Пакуль працаваць з дадзенымі дакументамі можна будзе толькі выбраным асобам па адмысловых дазволах, – піша рэцэнзент, – у нашай гістарыяграфіі (ва ўсіх яе разнастайных плынях і напрамках) будуць па-ранейшаму пашырацца неабгрунтаваныя міфы, а ідэалогія будзе выразна дамінаваць над навукай». Не ў нашай кампетэнцыі, зразумела, казаць пра тое, у якой ступені тыя ці іншыя гісторыкі абмежаваны ў сваім доступе да архіва КДБ. Але, наколькі вядома, дазвол знаёміцца з яго матэрыяламі і раней (асабліва ў 1990-я гады), і цяпер атрымоўвала няммала даследчыкаў, у тым ліку У. Міхнюк, Т. Процька (аўтар манаграфіі «Станаўленне савецкай таталітарнай сістэмы ў 1917–1941 гадах»), гісторыкі праваслаўнай царквы, якія працуюць над біяграфіямі навамучанікаў XX стагоддзя, г. зн. так ці інакш закранаюць тэму сталінскіх рэпрэсій. Ды той жа дырэктар беларускай рэдакцыі радыё «Свабода» А. Лукашук меў у свой час доступ да матэрыялаў крымінальнай справы Філістовіча. Але вынікам гэтага стала не аб'ектыўнае даследаванне (у чым, на мой погляд, і праявілася б сапраўдная павага да Філістовіча-чалавека, як бы хто да яго ні ставіўся), а глыбока тэндэнцыйная, перапоўненая тымі ж самымі «неабгрунтаванымі міфамі» кніжка «Філістовіч. Вяртаньне нацыяналіста».



Пэўныя абмежаванні на доступ да тых ці іншых матэрыялаў прысутнічаюць у абсалютнай большасці архіваў. А. Юркавец радыкальна прапануе «перадачу ўсіх тых дакумэнтаў, якія засталіся яму (Камітэту дзяржаўнай бяспекі – **Аўт.**) у спадчыну ад органаў АДПУ–НКУС–МДБ, на захаванне ў дзяржаўныя архівы, дзе з імі мог бы азнаёміцца любы ахвотны». Але ці будзе гэта правільным рашэннем? Па-першае, ёсць такое паняцце, як цэласнасць архіўных фондаў. Па-другое, многія крымінальныя справы сталінскага перыяду былі сфальсіфікаваны следчымі, таму знаёмства з імі патрабуе пэўнай падрыхтаванасці, найперш у этычным плане. Не ведаю, як «любы ахвотны», трапіўшы ў архіў, паставіцца да дакумента, з якога вынікае, што паважаны прафесар з пакутніцкім лёсам (расстраляны ў 1938 годзе) у 1920-я гады з'яўляўся правакатарам АДПУ. Альбо да пратаколаў допытаў, на якіх звар'яцелыя ад фізічных і маральных здзекаў людзі прызнаваліся Бог ведае ў чым. Друкаваць такія вырваныя з кантэксту «смажаныя факты» ў перыёдыцы без адэкватных каментарыяў, як гэта рабілася ў гады перабудовы? Здаецца, што гэта не наблізіць, а наадварот – аддаліць нас ад гістарычнай ісціны, калі яна ўсё ж існуе.

Наконт публікацыі падборкі дакументаў з крымінальнай справы Філістовіча А. Юркавец іранізуе: «Навошта гэтыя «адна-

* Гл. №№ 6–8 за 2008 год; 8 і 12 за 2009 год.

значныя» сведчанні праз больш чым паўстагоддзя па-ранейшаму трымаць за сямю замкамі і толькі часам нешта гады ў рады, па крупках прасеянае, кідаць, нібыта нейкую костку, зацікаўленай грамадскасці, суправаджаючы адпаведнымі каментарамі? Ці не прасцей было б апублікаваць усе гэтыя дакументы і тым самым адным махам падсекчы апанентам крылы, пазбавіць іхную ідэалогію ўсялякага маральнага падмурку, каб «свядомыя» раз і назаўсёды пераканаліся, што іхныя героі – фальшывыя, а ўсе тыя, хто дзесьці і калісьці выступаў пад бел-чырвона-белымі сцягамі – на самой справе вартыя жалю, глыбока амаральныя і нікчэмныя людзі?»

На жаль, шаноўны рэцэнзент не прапаноўвае спосаб, з дапамогай якога можна было б «адным махам» апублікаваць 23-томную крымінальную справу. У кожным томе некалькі сот старонак даволі сціслага рукапіснага і машынапіснага тэксту. Спецыялістаў-археографаў у Беларусі мала, паліграфічныя і фінансавыя магчымасці абмежаваныя. Нават беручы выпуск аднаго-двух тамоў у год, атрымліваем працу вялізнага калектыву даследчыкаў на працягу 15–20 гадоў. Так, ёсць яшчэ Інтэрнэт. Але трэба ведаць, на якім узроўні знаходзіцца ў Беларусі пытанне алічбоўкі гістарычных матэрыялаў. Значныя поспехі ў гэтай справе дасягнуты ў ЗША і краінах Заходняй Еўропы, уключаючы нашых суседзяў – Польшчу і Літву, ёсць пазітыўныя зрухі ў Расіі і Украіне. У Беларусі гэта справа пакуль ідзе павольнымі тэмпамі. Некаторая колькасць дарэвалюцыйных кніг у PDF-фармаце выстаўлена ў Фундаментальнай бібліятэцы БДУ. Адзіная буйная вэб-бібліятэка для Беларусі і са стопрацэнтна беларускімі матэрыяламі – «Камунікат» – робіцца падляшскімі беларусамі і фінансуецца ўрадам Польшчы. Практычных напрацовак у алічбоўцы, а галоўнае, у вэб-дэманстрацыі шматтомных архіўных спраў у нас, па сутнасці, няма. Кожны том трэба расшыць, алічбаваць з дапамогай сучаснай (далёка не таннай) апаратуры, зрабіць спецыяльны сайт, даць каментарый да кожнай выявы… І ўсе гэтыя тытанічныя намаганні за бюджэтны кошт толькі для таго, каб «падсекчы крылы» немаведама якім апанентам. Як па мне, дык пачаць алічбоўку трэба тады ўжо не са справы Філістовіча, а са старой беларускай перыёдыкі, з Літоўскай метрыкі, з каштоўных беларускіх дакументаў, раскіданых па розных замежных архівах, аб чым ужо пісалася не раз і не два.

Падборка дакументаў пра Філістовіча, якую А. Юркавец у палемічным запале называе «косткай», кінутай «зацікаўленаму грамадству», усё ж, на мой погляд, з'яўляецца лагічна цэласнай настолькі, наколькі можна «абняць неабдымнае» на васьмі старонках часопіснай публікацыі. Мэта была – надрукаваць тэксты шпіёнскіх данясенняў Філістовіча ў ЦРУ. Але без дадатковых матэрыялаў гэтыя бадзёрыя рэляцыі пра «даволі моцны партызанскі рух» у БССР і пра «партызан», пагалоўна прагнучых паслухаць беларускае радыё з Захаду**, маглі б увесці чытача ў зман і заблытаць. Таму спатрэбілася таксама прывесці фрагмент з допыту Філістовіча, на якім ён раскрывае сістэму шыфраў, што ўжываліся ў перапісцы з Б. Рагулем і прадстаўнікамі ЦРУ. Гэтаксама нельга было абысціся без дакументаў, у якіх тлумачыліся абставіны знаходжання копій гэтых данясенняў супрацоўнікамі МДБ, а таксама давалася афіцыйная ацэнка верагоднасці шпіёнскіх звестак, здабытых Філістовічам. Нарэшце, касацыйная скарга Філістовіча дазваляе зразумець, наколькі ён быў шчыры са следчымі, калі выдаваў ім шыфры. Перажыўшы ў савецкім зняволенні нейкі псіхалагічныя і светапоглядны


БЕЛАРУСКАЯ НАРОДНАЯ РЭСПУБЛІКА
УРАД БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАЙ РЭСПУБЛІКІ

Пасведчанне члена Рады БНР, выдадзенае Я. Філістовічу і знойдзенае ў яго пры арышце

** У гэтым сэнсе данясенні Філістовіча былі адным з аргументаў перад амерыканцамі для стварэння беларускай рэдакцыі радыё «Свабода» і працаўладкавання эмігранцкай вярхушкі, блізкай да ЦРУ.

надлом, ён, просячы захаваць сабе жыццё, пісаў: «Я добровольно отдал весь матерьял, компромитирующий врага в его преступной деятельности против Советского Союза, а также ключ-условность з заграницей для разоблачения его планов». Гэта ж касацыйная скарга, напісаная ў Мінску 11 лістапада 1953 года, дае дакладную дату, да якой Філістовіч не мог быць расстраляны (дагэтуль у літаратуры і на інтэрнэтсайтах часам прыводзяцца зусім надуманыя меркаванні пра дату яго смерці: ад 1952 года да вясны 1953-га).

Крытычны гэта падыход да крыніц і ўвядзення іх ва ўжытак альбо не? А. Юркавец усё ж угледзеў з майго боку «не вельмі крытычнае стаўленне да выключна спецыфічнай і неадназначнай крыніцы, якой па самой сваёй сутнасці з'яўляюцца любыя следчыя матэрыялы, і тым больш савецкія сталінскага часу». Гэта, вядома, права шаноўнага рэцэнзента рабіць такія высновы, тым больш калі ён асабіста і дэталёва правяраў, наколькі крытычна альбо некрытычна аўтар рэцэнзаванай публікацыі карыстаўся архіўнымі матэрыяламі.

У адным магу пагадзіцца з А. Юркаўцом, абсалютна не вагаючыся: следчыя матэрыялы сталінскага перыяду яшчэ чакаюць сваёй усебаковай крыніцазнаўчай ацэнкі. Пытанне аб «спецыфічнай і неадназначнай крыніцы», пастаўленае ў рэцэнзіі, мае рацыянальнае зерне. Трэба вітаць кожную спробу рэфлексіі над метадамі гістарычнага пазнання і над верагоднасцю крыніц, якімі карыстаюцца гісторыкі.

У сувязі з гэтым хацелася б звярнуцца да яшчэ адной крымінальнай справы з Цэнтральнага архіва КДБ. Гэта так званае «Уголовное дело по обвинению Ластовского Вацлава Устиновича и др.» пад нумарам 20951-С у 29 тамах, больш вядомае ў навуковай літаратуры як «справа Вацлава Ластоўскага» альбо «справа «Саюза вызвалення Беларусі (СВБ)». Упершыню значныя вытрымкі з яе ўвёў у навуковы ўжытак У. Міхнюк, які апублікаваў пратаколы допытаў В. Ластоўскага з 4-га тома і А. Дудара (Дайлідовіча) – з 19-га тома *[1; 2]*. Усяго па гэтай справе былі прыцягнуты да крымінальнай адказнасці 104 прадстаўнікі беларускай інтэлігенцыі. З іх, як гаворыцца ў даведцы Цэнтральнага



Вацлаў Юстынавіч Ластоўскі



Аркадзь Антонавіч Смоліч



Аляксандр Іванавіч Цвікевіч

архіва КДБ, 86 чалавек былі асуджаны па рашэнні судовага пасяджэння калегіі АДПУ СССР ад 10 красавіка 1931 года: 76 чалавек, у тым ліку В. Ластоўскі, – на 5 гадоў высылкі; 8 чалавек – на 5 гадоў канцлагера; 1 чалавек (П. Біндзюк) – на 3 гады канцлагера і 1 чалавек (А. Гурло) – на 5 гадоў высылкі ўмоўна. У дачыненні да 18 арыштаваных справа была спынена ў 1930 годзе ў працэсе следства. Некаторы час па «справе СВБ» праходзілі таксама беларусы-камуністы, якія займалі значныя пасады ва ўрадзе БССР, – Д. Прышчэпаў, А. Баліцкі, А. Адамовіч і П. Ільючонак. Паводле даных У. Міхнюка, іх справа ў снежні 1930 года была вылучана ў асобае вядзенне, а 18 сакавіка 1931 года пастановай калегіі АДПУ СССР усе чацвёра былі прыгавораны да 10 гадоў канцлагера.

Гэта была першая крымінальная справа ў адносінах да вялікай групы беларускіх дзеячаў культуры, навукі і адукацыі. Яна ж знаменавала сабой канец эпохі «беларусізацыі» ў БССР. Значная частка асуджаных была расстраляна ў перыяд далейшых рэпрэсій 1937–1938 гадоў. Усе яны пазней былі рэабілітаваны за адсутнасцю складу злачынства, бо сфальсіфікаванасць «справы СВБ» не падлягае сумненню.

Відаць, нялішнім будзе некалькі слоў сказаць пра склад крымінальнай справы № 20951-С паводле машынапіснага рэестра, напісанага архіўнымі супрацоўнікамі КДБ. Тамы 1–3 змяшчаюць матэрыялы на арышт і анкеты абвінавачаных. Том 4 – гэта пратаколы допытаў і ўласнаручныя паказанні В. Ластоўскага, І. Краскоўскага, С. Некрашэвіча. Том 5 – пратаколы допытаў С. Некрашэвіча, выканаўчая перапіска і матэрыялы аб вызваленні асуджаных пасля адбыцця імі мер пакарання. Том 6 – пратаколы допытаў А. Цвікевіча, А. Смоліча. Том 7 – А. Смоліча, П. Трамповіча (Трэмповіча), М. Грамыкі. Том 8 – У. Чаржынскага, І. Серады, М. Каспяровіча. Том 9 – М. Каспяровіча, А. Шлюбскага, М. Улашчыка. Тамы 10–20 – пратаколы допытаў іншых арыштаваных, якія праходзілі па справе (на жаль, больш падрабязныя звесткі даць немагчыма; вядома, што ў 19-м томе знаходзяцца пратаколы допытаў А. Дудара). Тамы 21–24 – пратаколы допытаў М. Байкова і сведак па справе.

Том 25 – абвінавачае заключэнне і рашэнне па справе. Яго кароткі агляд зрабіў У. Калеснік *[3, с. 323–324]*. Тамы 26–29 – матэрыялы праверак і вызначэнняў Вярхоўнага суда БССР аб пераглядзе справы. Таксама да 1-га тома прыкладзены спіс асоб, асуджаных па гэтай справе, з указаннем тэрмінаў пакарання, тамоў і старонак справы, на якіх змешчаны звязаныя з імі матэрыялы. Трэба сказаць, што архіўны рэестр, на падставе якога зроблены гэты агляд, можа быць няпоўным, бо, напрыклад, у 4-м томе таксама змешчаны паказанні Я. Лёсіка, што не адлюстравана ў рэестры. У 29-м томе знаходзяцца некаторыя пасляваенныя матэрыялы адносна А. Шэйніна, П. Бузука, П. Зенюка, С. Хурсіка, А. Шлюбскага, У. Чаржынскага ды іншых. Тут жа падшыты ліст Аляксандры Ігнацьеўны Смоліч у праваахоўныя органы СССР з просьбай аб рэабілітацыі і падрабязнай біяграфіяй яе мужа А. Смоліча.

Яшчэ У. Міхнюк, першы публікатар паказанняў В. Ластоўскага, выказаў асцярожныя і цалкам абгрунтаваныя сумненні адносна іх верагоднасці, нават нягледзячы на тое, што паказанні былі напісаны ўласнаручна. «19 лютага 1931 года В. Ластоўскаму было аб'яўлена аб заканчэнні папярэдняга следства, – пісаў ён. – За гэты час яго дзясяткі разоў дапытвалі, але вынікі допытаў былі аформлены своеасабліва – былы прэм'ер уласнай рукой выклаў на паперы ўсё, аб чым раней ішла размова ў кабінетах следчых. Такія паказанні атрымалі назву ўласнаручных. Зразумела, давер да таго, што напісана ўласнаручна, непараўнальна большы, чым да таго, пад чым стаіць часта змушаны подпіс: «Запісана з маіх слоў верна, мною прачытана». Але чытаючы «ўласнаручныя» паказанні В. Ластоўскага, бачачы, што ён часам незаслужана агаворваў і сябе, і іншых, мы не павінны, не маем права зларадніцаць, – выхопліваць з тэксту асобныя радкі: ага, вось якая ты асоба! Гэта пісалася не ва ўтульным пакоі дома адпачынку, а ў турэмнай камеры. А па-другое, В. Ластоўскі, безумоўна, намагаўся выратаваць сябе, сваю сям'ю, родных і блізкіх, урэшце, беларускую справу...» *[1, № 8, с. 206]*. Пры гэтым У. Міхнюк спасылаўся на меркаванне былога салавецкага вязня акадэміка Д. Ліхачова аб тым, што ў асобныя справы ЧК, АДПУ ці НКУС следчыя заносілі толькі тыя матэрыялы, якія пацвярджалі раней складзеную версію.



Язэп Лёсік з сям'ёй. Канец 1920-х гадоў

З улікам гэтых каштоўных заўваг паказанні В. Ластоўскага, як і іншых арыштаваных па «справе СВБ», бачацца ў іншым святле. Безумоўна, калі В. Ластоўскі «ўласнаручна» прызнаваўся, што яму «надо очистить себя огнем признания, сжечь все мосты и мостики с прошлым, стануть обнаженным и с поникшей головой перед массами, чтобы воспрянуть к новой лучшей жизни», то ўжо нават са стылістычнага пункту гледжання гэта выклікае пэўныя падазрэнні: ці такой лексікай выказваў свае думкі былы прэм'ер БНР? Нешта тут не тое. Але і паказанні, што датычацца, напрыклад, ковенскага перыяду БНР, нягледзячы на свой больш спакойны і разважлівы характар (маса гістарычных дэталяў, важных падрабязнасцей, характарыстык людзей), таксама павінны разглядацца як у пэўнай ступені змушаныя альбо нават у нечым сфальсіфікаваныя. Гэтыя паказанні В. Ластоўскі пісаў у адказ на канкрэтныя, тэндэнцыйна падабраныя і сфармуляваныя пытанні следчага, пад яго пільным наглядам і кантролем, што, у сваю чаргу, диктавала яму падбор фактаў, парадак падачы матэрыялу і абмяжоўвала яго самацэнзурай.

Пра метады следства падчас «справы СВБ» успамінаў у 1950-я гады былы супрацоўнік Дзяржплана БССР Аркадзь Шэйнін, арыштаваны ў Мінску ў ноч з 4 на 5 снежня 1930 года: «Начиная с утра 7 декабря до 13 декабря я находился на допросе. Я сидел днем и ночью на стуле, менялись следователи, которые предлагали написать несколько слов о том, что я сознаюсь в своей контрреволюционной деятельности» (т. 29, арк. 113). Вёў гэта, так бы мовіць, «следства» начальнік аднаго з аддзяленняў эканамічнага аддзела ПП АДПУ па БВА па прозвішчы Кац. Па словах А. Шэйніна, «если мое показание, написанное мною, не удовлетворяло Каца, он его рвал и, указывая на то, как оно должно быть написано, добивался тех формулировок, которые в конечном счете устраивали следствие» (т. 29, арк. 114). Здаецца,

гэта сведчанне крыху прыадчыняе завесу над тым, што ўяўлялі сабой у 1930 годзе «ўласнаручныя» паказанні ў сценах АДПУ. Даведзены да псіхічнай хваробы, А. Шэйнін у турме спрабаваў пакончыць жыццё самагубствам. У псіхіятрычную бальніцу да яго 18 лютага 1931 года «явился Кац, осведомился у меня о моем здоровье и предложил мне написать заявление о том, что я симулировал расстройство нервной системы. Обстановка в больнице еще больше усугубила мое состояние, и я все время пытался оттуда вырваться. Это повлияло на то, что я карандашом в больнице написал заявление, от слова до слова продиктованное Кацем. Я был посажен на автомашину и в тот же день написал показание, которое при обычных условиях допроса я ни при каких условиях не мог написать даже при ослабленной воле к сопротивлению. Начиная с 18 февраля, Кац ежедневно брал у меня показания, содержание которых мне навязывали» (т. 29, арк. 116–117).

Красамоўнай ілюстрацыяй могуць служыць таксама некаторыя паказанні Я. Лёсіка з 4-га тома «справы СВБ». Так, да справы (аркуш 297) падшыта наступнае «ўласнаручнае» прызнанне Я. Лёсіка, напісанае чамусьці чырвоным чарнілам:

«Тов. Н.С.О.*** Аргову.

Настоящим заявляю, что существовал «Союз освобождения Белоруссии» с своим руководящим центром, куда я входил как одно из центральных лиц этой организации. Я признаю свою вину, участвуя в этой контр-револоцыйнай организации, и заслужил самой суровой кары. Сознание этой вины для меня тяжеле самого наказания и прошу одного – честной работой на пользу социалистического строительства снять этот контр-революционный *[слова выпраўлена са слова «контр-револоцыйный»]* позор с моих малолетних детей. Добавляю, что эта организация имела свою платформу, о чем детальнее покажу, что *[далей закрэслена: «буду знать»]* я знаю, на последующих своих показаниях при допросах.

31.VIII.30 г. И.Ю. Лёсик.

Зачыркнутаму і напісанаму зьверху ў 3-м радку зьнізу верыць. Я. Лёсік».

*** Н.С.О. – начальник секретного отделения.




Мемарыяльная дошка, прысвечаная Максіму Гарэцкаму, на сцяне корпуса № 4 сельскагаспадарчай акадэміі ў г. Горкі Магілёўскай вобласці

Гэтае фантасмагарычнае і, без сумненняў, прадыктаванае следчым «прызнанне» ўражвае не толькі сваім трагізмам (ясна, што Я. Лёсіка шантажавалі лёсам яго сям'і), але і яўнай спробай арыштанта даць своеасаблівы знак для нашчадкаў, для тых, хто будзе чытаць гэты дакумент праз гады. Відаць, знарок напісанае і закрэсленае «буду знать», фраза «зачыркнутаму... верыць» – усё гэта прачытваецца як выразны сігнал: кожнае слова тут сфальсіфікавана!

Але звернемся да іншага фрагмента з паказанняў Я. Лёсіка ад 2 верасня 1930 года, які датычыцца вядомай тэлеграмы кайзеру Вільгельму, адпраўленай дзеячамі БНР у 1918 годзе. Вось цытата (арфаграфія захавана):

«Тарашкевич не раз поднимал вопрос о политической изоляции Белоруси от русских и польских национальных влияний. Эту изоляцию, как нам казалось, давала немецкая оккупация. И мы решили использовать немецкую окупацию насколько это возможно, тем более, что такая установка взята была уже белорусскими деятелями в Вильно (газета «Гомон»).

Прежде всего, мы старались овладеть просвещением для организации белорусских школ. Тогда была открыта первая белорусская гимназия в Минску по б. Александровской улице, а таксама первые белорусские учительские курсы. Потом орга-

ГДЕ КУПИТЬ ЖУРНАЛ?

АДРЕСА МАГАЗИНОВ И КИОСКОВ «БЕЛСОЮЗПЕЧАТИ» В МИНСКЕ, ГДЕ ПРОДАЕТСЯ ЖУРНАЛ «БЕЛАРУСКАЯ ДУМКА»:

Автовокзал «Восточный»
Ул. Володарского, 16
Ул. Володарского, 22
Ул. Есенина, 16
Ул. Жилуновича, 31
Ул. Жуковского, 5/1
Ул. Жуковского, 10А
Ул. Запорожская, 22
Ул. Кижеватова, 80/1
Ул. Я. Коласа, 67
Ул. Ленина, 14
Ул. Ленина, 15
Ул. К. Маркса, 1
Ул. К. Маркса, 21
Ул. К. Маркса, 38
Нац. аэропорт Минск
Пр. Независимости, 8
Пр. Независимости, 44
Пр. Независимости, 74
Пр. Партизанский, 56
Пр. Победителей, 51/1
Пр. Победителей, 91
Пл. Привокзальная, 3
Пр. Пушкина, 77
Пр. Рокоссовского, 140
Ул. Славинского, 37А
Ул. Советская, 11
Ул. Сурганова, 40
Ст. метро «Пл. Победы»
Ст. метро «Пушкинская»
Ст. метро «Уручье»
Торг. центр «Столица»
Ул. М. Танка, 16
Ул. Филимонова, 63
Ул. В. Хоружей, 24 к. 2
Бул. Шевченко, 7

низован был белорусский кураториум просвещения во главе с академиком Карским и его секретарем Тарашкевичем (на Карском настояли немецкие окупационные власти, им нужен был ученый авторитет). При немцах существовала некоторое время и Рада Белорусской Народной Республики.

Понятно, немцы требовали публичного выражения наших отношений к Германии. Отсюда наша телеграма Вильгельму.

Мы понимали, что немецкая оккупация не прочна, временная и что телеграмма Вильгельму – наша политическая компрометация, но «блажен, иже кто и душу свою отдает за народ свой». Так говорил мне А. Гарун, когда я колебался давать свою подпись в телеграмме (я был тогда председателем Рады БНР), а Смолич добавил, что когда придут большевики, то можно будет убежать в Польшу. Телеграмма же нам нужна для белорусского национального дела; нам нужно кричать на всю Европу, что Белорусь живет и требует своего места среди народов. Понятно, некоторые, как, например, помещик Скирмунт, связывали с телеграммой к Вильгельму свои личные, не белорусские национальные комбинации, но имя Скирмунта, как и Карского, нужно было немцам. Пришлось делать перевыборы секретариата Рады БНР с тем, чтоб ввесть в его состав Скирмунта. Так была организована посылка телеграммы Вильгельму. От этой телеграммы мы, культурные работники, ничего не ожидали, а смотрели на нее как на неизбежную дань немцам за те уступки, какие делали нам оккупационные власти на культурном фронте.

Вообще при слабости Белоруси во всех отношениях мы старались использовать всякую политическую кон'юнктуру для культурно-национальной работы, для поднятия национального самосознания в белорусском народе. Именно в народе, в его целом, а не в отдельном классе. В этом случае, иногда несознательно мы больше рассчитывали на белорусскую буржуазию, а на крестьянство смотрели, как на сырую этнографическую массу, которая должна пойти за своей интеллигенцией.



Асуджаныя ў 1930-я гады па справе «Саюза вызвалення Беларусі» Гаўрыла Гарэцкі і Уладзімір Дубоўка. Масква, май 1970 года

Советская Белорусь давала найболее широкие возможности для культурно-национальной работы и, кроме того, предоставляла необходимое материальное обеспечение для каждого из нас. И в Советскую Белоруссию стали стекаться все старые нац.-демократические силы.

Постепенно в советских условиях образовалась прежняя нац.-демократическая организация, спаянная не писанным уставом, а единством политических нац.-демократических установок в национальном вопросе. Эта организация стремилась взять в свои руки белорусский вопрос во всем его об'еме. Она вела наступление на партийную линию не только в национальном вопросе, но также стремилась влиять на аграрную политику, проводя свою кулацкую линию (прищеповщина) и на вопросы социалистического строительства (солидаризация с группой Бухарина и вообще с правыми партийными элементами)» (т. 4, арк. 346-346 адв.).

Гэты фрагмент – яскравы прыклад таго, як разважлівы і, здаецца, спачатку падрабязна-аб'ектыўны аповед плаўна пераходзіць у прадыктаваны следчым самаагавор. Здаецца, следчы даў накірунак для паказанняў Я. Лёсіка пытаннем пра тэлеграму Вільгельму, а калі той спрабаваў абмежавацца згадкай пра аднаго толькі Б. Тарашкевіча (які знаходзіўся ў Польшчы і быў пакуль недасягальны для АДПУ), то следчы стаў патрабаваць ад Я. Лёсіка іншыя імёны. Так з'явіліся ў паказаннях імёны А. Гаруна (тады ўжо нябожчыка) і А. Смоліча. Далейшая пабудова і фактура гэтых паказанняў была выгадная следству: Я. Лёсік тут фактычна не праводзіў розніцы паміж беларускай нацыянальна-культурнай работай пры нямецкай акупацыі і пры савецкай уладзе; раптам усплылі сумна вядомае паняцце «нац.-демократические силы» і арыентацыя «нацдэмаў» на буржуазію, раптам з'явіліся шматзначныя згадкі пра Прышчэпава і Бухарына... Перад намі быццам крывое люстэрка, у якім праўда і хлусня так цесна перапляліся, што іх часам немагчыма адрозніць адну ад адной. Дзе тут словы і думкі Я. Лёсіка, а дзе – следчага?

***

Як бы ні хацелася «адным махам» апублікаваць шматтомныя крымінальныя справы

перыяду сталінскіх рэпрэсій, але гэта задача, відаць, не аднаго года альбо нават дзесяцігоддзя. Публікацыя ж фрагментаў альбо тэматычных падборак не заўсёды можа даць адэкватнае ўяўленне аб усёй справе, з якой узяты асобныя дакументы (тут я згодны з А. Юркаўцом). Тым не менш, іншага выйсця пакуль няма. Таму вельмі важна асэнсоўваць не толькі ступень верагоднасці выбраных для друку матэрыялаў, але і метадалагічныя аспекты, а менавіта – што і як трэба друкаваць. Пратаколы допытаў, як і ўласнаручныя паказанні, у многіх выпадках афармляліся ў двух экзэмплярах: першы (арыгінал) пісаўся ад рукі, а другі – передрукоўваўся на машынцы. Часта ў двух экзэмплярах сустракаюцца розначытанні. Да таго ж рукапісны экзэмпляр часам туга пераплецены ў томе, таму частку тэкста можна ўзнавіць толькі з дапамогай машынапіснага. З другога боку – у машынапісным тэксце маюцца падкрэсліванні і нататкі, якія рабіліся прадстаўнікамі следства, і важныя для разумення ходу справы. Неабходная ўмова – карыстанне для публікацыі арыгіналам пратакола допыту (пажадана рукапісным) з подпісамі падследнага і следчага. У гэтым я лішні раз пераканаўся, калі ў Нацыянальным архіве знайшоў копію дакумента пра Станіслава Станкевіча, фальсіфікаваную ў 1960-я гады (у яе былі дапісаны словы, якіх няма ў арыгінале з Цэнтральнага архіва КДБ).

Самае галоўнае – пратаколы допытаў і нават «уласнаручныя» паказанні па сваёй сутнасці гэта не апавядальныя крыніцы, як можа падацца на першы погляд, а матэрыялы справаводства. Таму для іх адэкватнага ўспрымання трэба заўсёды ўстанаўліваць асобы супрацоўнікаў, якія вялі следства. Хто былі гэтыя нябачныя «суаўтары» В. Ластоўскага, Я. Лёсіка і іншых падследных па «справе СВБ»? На гэтае пытанне можна адказаць больш-менш дакладна.

Падчас перагляду «справы СВБ» у 1956 годзе быў пададзены запыт ва ўпраўленне кадраў КДБ пры Савеце Міністраў СССР аб супрацоўніках АДПУ, якія вялі следства і, як мяркую, падазраваліся ў фальсіфікацыях. Усяго ў запыце фігуравалі 18 чалавек. З іх ліку знайшліся біяграфічныя звесткі на дванаццаць (т. 29, арк. 270–273):

1) Рапапорт Рыгор Якаўлевіч, паўнамоцны прадстаўнік АДПУ па Беларускай ваеннай акрузе – старшыня ДПУ БССР. 1890 г.н., ураджэнец мястэчка Глуск Мінскай вобл. У 1931–1936 гадах – паўнамоцны прадстаўнік АДПУ па Уралу. Загадам НКУС СССР № 240 ад 15.VII.1936 года звольнены з пасады начальніка УНКУС Сталінградскага края. Расстраляны ў 1938 годзе.


Рыгор Якаўлевіч Рапапорт


Якаў Саулавіч Агранаў

2) Агранаў Якаў Саулавіч, начальнік сакрэтнага (з сакавіка 1931 года – сакрэтна-палітычнага) аддзела АДПУ СССР. 1893 г.н., ураджэнец мястэчка Чачэрск Гомельскай вобл. Да звальнення з органаў НКУС працаваў начальнікам УНКУС Саратаўскай вобласці. Расстраляны ў 1937 годзе.

3) Славацінскі Аляксандр Сяргеевіч, начальнік 3-га аддзялення сакрэтнага аддзела АДПУ СССР. 1892 г.н., ураджэнец г. Куйбышаў. Да звальнення з органаў НКУС працаваў памочнікам начальніка УНКУС Саратаўскай вобласці. Расстраляны ў 1939 годзе.

4) Аргаў Залман Кусіелевіч, начальнік сакрэтнага аддзела паўнамоцнага прадстаўніцтва (ПП) АДПУ па Беларускай ваеннай акрузе (дапытваў Я. Лёсіка). 1897 г.н., ураджэнец г. Варонеж. 10.XII.1934 выключаны са спісаў асабовага складу НКУС у сувязі са смерцю.

5) Муляўка Пракофій Сямёнавіч, начальнік эканамічнага аддзела ПП АДПУ па БВА. 1888 г.н., ураджэнец с. Астрамечава былой Гродзенскай губ. 25.IX.1935 года адкамандзіраваны ў распараджэнне Вярхоўнага суда УССР на пасаду старшыні Спецкалегіі. У чэрвені 1937 года зняты з уліку «чекзапаса» ў сувязі з арыштам. У тым жа годзе расстраляны.

6) Сікорскі (Скрыпко) Міхаіл Фёдаравіч, выконваючы абавязкі старшага ўпаўнаважанага 1-га аддзялення сакрэтнага аддзела ПП АДПУ па БВА (дапытваў В. Ластоўскага)****. 1903 г.н., ураджэнец г. Панявеж былой Ковенскай губ. Загадам НКУС СССР № 2234 ад 17.XI.1937 года звольнены з органаў «за невозможностью дальнейшего использования». Да звальнення працаваў начальнікам 4-га аддзялення – памочнікам начальніка 4-га аддзела УНКУС Калінінскай вобласці.

**** Паводле звестак У. Калесніка, 26 жніўня 1931 года займаў пасаду старшага ўпаўнаважанага 2-га аддзела Сакрэтнага аддзела ПП АДПУ па БВА [3, с. 323–324].

7) Траянаў Васіль Арцем'евіч, выконваючы абавязкі старшага ўпаўнаважанага 2-га аддзялення сакрэтнага аддзела ПП АДПУ па БВА. 1902 г.н., ураджэнец в. Ячава Слуцкага раёна Мінскай вобл. 5.VIII.1934 года звольнены з органаў НКУС «за невозможностью дальнейшего использования». Да звальнення працаваў начальнікам 2-га аддзялення сакрэтна-палітычнага аддзела ПП АДПУ БССР.

8) Карпік Васіль Сямёнавіч, часова выконваючы абавязкі ўпаўнаважанага эканамічнага аддзела ПП АДПУ па БВА. 1900 г.н., ураджэнец в. Капыльшчына былога Дзісенскага павета Віленскай губ. 22.IX.1934 года накіраваны на працу ў Вярхоўны суд БССР з залічэннем у асобны рэзерв НКУС СССР. З'яўляючыся старшынёй Спецкалегіі Вярхоўнага суда БССР, прымаў актыўны ўдзел у працэсах над беларускай інтэлігенцыяй у 1937 годзе. Зняты з уліку «чекзапаса» ў верасні 1940 года. У 1950–1960-я гады – навуковы супрацоўнік аддзела прававых навук, потым Інстытута філасофіі і права АН БССР. У 1980 годзе ўзнагароджаны ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР «за большую работу по коммунистическому воспитанию трудящихся» *[4]*.

9) Юдашкін Майсей Хацкелевіч, старшы ўпаўнаважаны эканамічнага аддзела ПП АДПУ па БВА. 1904 г.н., ураджэнец в. Алешня Гараднянскага раёна Чарнігаўскай вобл. Загадам НКУС СССР № 850 ад 14.IV.1939 года звольнены з органаў «за невозможностью дальнейшего использования». Да звальнення працаваў намеснікам начальніка УНКУС Мурманскай вобласці.

10) Колцін Трафім Мікалаевіч, супрацоўнік рэзерва ўпраўлення пагранічнай аховы і войскаў ПП АДПУ па БВА. 1902 г.н., ураджэнец с. Пустынь Бялінскага раёна Пензенскай вобл. Загадам МДБ СССР № 830 ад 5.III.1947 года звольнены з органаў па стану здароўя. Памёр у 1954 годзе.

11) Сіманоўскі Беніцыян Шаломавіч, памочнік упаўнаважанага сакрэтнага аддзела ПП АДПУ па БВА. 1902 г.н., ураджэнец мястэчка Азарычы Мазырскага раёна Гомельскай вобл. Загадам НКУС СССР № 559 ад 21.III.1939 года звольнены з органаў «за невозможностью дальнейшего использования». Да звальнення – памочнік начальніка 11-га аддзела НКУС БССР.



Асуджаны ў 1930-я гады па справе «Саюза вызвалення Беларусі» Мікалай Улашчык. Масква, ліпень 1986 года

12) Дамарацкі Антон Іванавіч, памочнік упаўнаважанага ПП АДПУ па БВА. 1904 г.н., ураджэнец мястэчка Копысь Аршанскага раёна Віцебскай вобл. Загадам Міністэрства юстыцыі СССР № 262/лг ад 25.IV.1953 года звольнены з органаў па скарачэнні штатаў. Да звальнення працаваў у «Сталинградгидрострое».

Яшчэ шасцёра былых супрацоўнікаў АДПУ, якія вялі «справу СВБ», у 1956 годзе не праходзілі па ўліку ўпраўлення кадраў КДБ пры Савеце Міністраў СССР. Сам гэты факт, верагодна, ускосна сведчыць, што ўсе яны загінулі пад час рэпрэсій 1937–1938 гадоў. Гэта былі:

13) Гродзіс Іван Ігнацьевіч, у 1930 годзе намеснік паўнамоцнага прадстаўніка АДПУ па БССР. Маюцца звесткі пра чалавека з такім самым прозвішчам і імем 1897 г.н, ураджэнца мястэчка Салокі Новаляксандраўскага павета Ковенскай губ., па нацыянальнасці літоўца, члена ВКП(б), які ў 1937 годзе працаваў начальнікам Лузскай лесапрыстані «Севтранслеса» (у Горкаўскай вобласці), быў арыштаваны 6 жніўня 1937 года і праз год расстраляны *[5, с. 121]*.

14) Радзівілоўскі Аляксандр Паўлавіч (Ізраіль Майсеевіч), памочнік начальніка 3-га аддзялення сакрэтнага аддзела АДПУ СССР. 1904 г.н., ураджэнец г. Сімферопаль. Арыштаваны ў 1938 годзе. На момант арышту займаў пасаду начальніка 3-га аддзела 3-га (транспартнага) упраўлення НКУС СССР. Расстраляны ў 1940 годзе.

15) Мартыненка, памочнік начальніка 5-га аддзялення контрразведвальнага аддзела (ПП АДПУ па БВА?).

16) Каласкоў, упаўнаважаны эканамічнага аддзела ПП АДПУ па БВА.

17) Лукоўскі – упаўнаважаны ўпраўлення пагранічнай аховы і войскаў ПП АДПУ па БВА.

18) Сураў, упаўнаважаны Бабруйскага акраддзела ПП АДПУ па БВА.

Да фальсіфікацый, несумненна, мелі дачыненне і іншыя супрацоўнікі беларускага ДПУ. Вышэй было сказана пра дзейнасць чэкіста Каца. Адзін з арыштаваных

па «справе СВБ» П. Зянюк у сваёй заяве ў КДБ пры Савеце Міністраў СССР ад 6 жніўня 1963 года згадваў, што ў 1930 годзе яго дапытваў следчы Іосіф (Іосель) Эстрын. Ён прад'явіў яму першае абвінавачанне – ва ўдзеле ў «Саюзе вызвалення Беларусі», а другое – у замаху на жыццё Я. Гамарніка. «Второе обвинение, которое мне предъявил Эстрин – это участие в заговоре на жизнь Я. Гамарника (тогда секретаря ЦК КП(б)Б), – пісаў П. Зянюк. – Мне сразу стало ясно, что Эстрин фабрикует этот «заговор» с целью придать больший политический вес Я. Гамарнику» (т. 29, арк. 381).

Выяўленне асоб, біяграфій, палітычных і кар'ерных матываў, якімі кіраваліся супрацоўнікі праваахоўных і рэпрэсіўных органаў, безумоўна, з'яўляецца важнейшай задачай пры працы з крымінальнымі справамі перыяду сталінскіх рэпрэсій. У прыватнасці, звяртае на сябе ўвагу, што з чатырнаццаці супрацоўнікаў АДПУ, якія вялі «справу СВБ» і біяграфіі якіх мы ведаем, сямёра (Рапапорт, Агранаў, Муляўка, Траянаў, Карпік, Сіманоўскі, Дамарацкі) былі ўраджэнцамі Беларусі ў яе цяперашніх межах, а яшчэ трое (Сікорскі, Юдашкін, Гродзіс) паходзілі з сумежных тэрыторый Літвы і Чарнігаўшчыны, цесна звязаных з Беларуссю ў гістарычным і культурным аспектах. Гэта крыху не адпавядае рамантычнай версіі, што беларускую інтэлігенцыю ў 1930–1931 гадах рэпрэсіравалі выключна нейкія «чужынцы» і «прыхадні». У. Міхнюк, напрыклад, катэгарычна сцвярджаў, што «супрацоўнікі ДПУ не валодалі мовай таго народа, над інтэлектуальным сумленнем якога здзекаваліся і тварылі бязлітасны суд» *[2, с. 39]*. Але нельга забываць, што частка справаводства ў беларускім паўнамоцным прадстаўніцтве АДПУ у той час вялася на беларускай мове, прычым на тарашкевіцы, тады яшчэ афіцыйным правапісе (сам жа У. Міхнюк надрукаваў фотакопію аднаго з такіх дакументаў). Ледзь не адзіным са следчых, хто выжыў у эпоху рэпрэсій і дажыў да глыбокай старасці, быў беларус Карпік. Ён нават зрабіў пэўную навуковую кар'еру, нібыта замяніўшы сабой інтэлігентаў, рэпрэсіраваных па «справе СВБ». Замена, зрэшты, была надта нераўнацэнная.



Савецкі плакат (фрагмент). Пачатак 1930-х гадоў

***

Вяртаючыся да справы Філістовіча, трэба падкрэсліць, што ніякіх слядоў фальсіфікацый у даступных мне матэрыялах з яе я не ўбачыў. У пратаколах допытаў няма гэтых стылістычных «швоў» і грубых падтасовак, якія можна заўважыць, напрыклад, у паказаннях па «справе СВБ». У справе Філістовіча захаваны многія матэрыялы, нявыгадныя для следства, напрыклад, яго ўпартыя адмовы прызнаць саўдзел у нацысцкіх злачынствах. Не знаходжу і матываў для следчых, каб яны фальсіфікавалі гэту справу: Філістовіч быў схоплены па гарачых слядах, не было ніякіх сумненняў у яго шпіёнскай дзейнасці. У турме, наколькі вядома, абыходзіліся з ім няжорстка: прынамсі, у касацыйнай скарзе Філістовіч піша пра шматлікія кнігі, прачытаныя ў камеры (Ластоўскі ці Лёсік, мусіць, і марыць аб гэтым не маглі).

Калі куратары справы палічылі, што доказаў калабаранцкай дзейнасці Філістовіча ў гады вайны недастаткова для судовага працэсу, справа была перададзена на даследаванне і былі прыцягнуты матэрыялы больш ранніх крымінальных спраў у адносінах былых ваеннаслужачых 13-га паліцэйскага батальёна (у тым ліку ведамасць аб выдачы вінтоўкі за 17 мая 1943 года з подпісам Філістовіча). У пратаколах допытаў Філістовіча выразна прасочваецца працяглая псіхалагічная барацьба паміж ім і следчымі, бо Філістовіч разумеў, што абвінавачанне ў ваенных злачынствах пагражае яму смерцю. Разам з тым у паказаннях адносна свайго жыцця ў Францыі і Бельгіі Філістовіч быў вельмі адкрыты, таму гэтыя матэрыялы з'яўляюцца каштоўнай крыніцай па гісторыі беларускай пасляваеннай эміграцыі.

**Алег ЛІЦКЕВІЧ**

ЛІТАРАТУРА

1. Міхнюк, У. Справа Вацлава Ластоўскага / У. Міхнюк // Маладосць. – 1993. – № 8. – С. 203–242; – № 9. – С. 211–246.
2. Міхнюк, У. Арыштаваць у высылцы. Дакументальны нарыс пра Алеся Дудара / У. Міхнюк. – Мінск, 1996.
3. Калеснік, У. Усё чалавечае. Літаратурныя партрэты, артыкулы, нарысы / У. Калеснік. – Мінск, 1996.
4. Лейзеров, А. Опыт проведения суда по собственному доносу. 1937 год и другие / А. Лейзеров // Репрессивная политика советской власти в Беларуси. – Вып. 2. – Минск, 2007. – С. 147–151.
5. Еремина, Л.С., Рогинский, А.Б. Расстрельные списки. Книга памяти жертв политических репрессий / Л.С. Еремина, А.Б. Рогинский. – М., 2000.